сануе з багатай гісторыяй, культурнымі здабыткамі, непаўторнымі помнікамі Беларусі..."[6].

Безумоўна, супрацоўнікі гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе" творча працуюць у накірунку паляпшэння музейна-педагагічнай дзейнасці, і гэта дае падставу меркаваць, што праз пэўны час існуючая праграма ўзбагаціцца як новымі заняткамі, так і новымі тэматычнымі блокамі.

---

[1] *Медведева Е. Б., Юхневич М. Ю.* Музейная педагогика как новая научная дисциплина // Культурно-образовательная деятельность музеев: Сб. трудов. М., 1997. С. 8.

[2] *Чумалова Т. В.* Роль музейных программ в культурно-образовательном процессе московских школ // Музей. Образование. Культура. Процессы интеграции: Сб. трудов. М., 1999. Вып. 2. С. 52.

[3] *Юхневич М. Ю.* Музейно-образовательные проекты для школы: отечественный и зарубежный опыт // Музей. Образование. Культура. Процессы интеграции: Сб. трудов. М., 1999. Вып. 2. С. 32—34.

[4] *Міронмык В. У., Залуцкая В. Л.* Музейна-педагагічная праграма для пачатковай школы "Мая Радзіма — Беларусь" // Музейная педагогіка. Праблемы арганізацыі работы з дзецьмі. Музейныя сшыткі: Навукова-метадычны зборнік. Мн., 1997. С. 15.

[5] *Франкл В.* Человек в поисках смысла. М., 1990. С. 47.

[6] *Міронмык В. У.* Комплексная навуковая праграма музейна-педагагічнай дзейнасці гісторыка-культурнага запаведніка "Заслаўе". Заслаўе, 1998. С. 17. (Архіў ГКЗ "Заслаўе".)

**А. Р. Мацевасян** (*Мінск*),
*метадыст вучэбнага аддзела БелДІПК*

# АДУКАЦЫЙНАЯ ПАЛІТЫКА І ВЫХАВАННЕ ПАТРЫЯТЫЗМУ СРОДКАМІ ВАЕННА-ГІСТАРЫЧНЫХ МУЗЕЯЎ

Нацыянальную адукацыю і выхаванне можна вызначыць як гістарычна ўсталяваную сацыяльна-культурную тэхналогію, на аснове якой новыя пакаленні ўключаюцца ў "трансліруемы культурай сацыяльны вопыт, засвойваюць яго і пераўтвараюць родавы змест канкрэтнай культуры ў асабовыя сімвалы і знакі, што забяспечвае працэс развіцця нацыянальнай культуры і этнасу ў цэлым"[1].

У самым агульным выглядзе мэта нацыянальнай адукацыі і выхавання вызначаецца як узнаўленне і развіццё нацыянальнага тыпу асобы са светапоглядам, які адпавядае сучасным сацыяльным патрабаванням: выхаванне грамадзяніна сваёй краіны і свету з характарыстыкамі нацыянальнага менталітэту. Сутнасцю нацыянальнай адукацыі і выхавання з'яўляецца перадача маладому пакаленню сацыяльна-цэнаснага вопыту этнасу з мэтай фарміравання яго нацыянальнай ментальнасці, выхаванне на гэтай аснове асабовых рыс грамадзяніна сваёй краіны.

Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь у сферы адукацыі і выхавання грунтуецца на пэўных прынцыпах. Адзін з іх — "прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей, выхаванне жыхароў рэспублікі дасведчанымі ў сусветнай гісторыі, паваж-

лівымі да палітычных, эканамічных і сацыяльных правоў, культуры і традыцый усіх народаў"[2]. Тым не менш асноўная задача нацыянальнай адукацыі і выхавання — фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці асобы як асновы выхавання патрыятычных пачуццяў да роднай зямлі, да свайго народа, гатоўнасць працаваць на іх карысць, выхаванне падрастаючага пакалення як грамадзян Беларусі, як патрыётаў сваёй Радзімы.

Сучасны этап развіцця нашай дзяржавы патрабуе пераасэнсавання зместу выхаваўчай работы з моладдзю. Прыярытэтным напрамкам выхавання павінна стаць сфера агульнапрызнаных чалавечых каштоўнасцей. Такімі, перш за ўсё, з'яўляюцца патрыятызм і любоў да сваёй Радзімы.

Патрыятызм — з'ява гістарычная. Ён выяўляе адносіны да дзяржаўнага ладу, да сваёй радзімы, суайчыннікаў. Патрыятызм (ад грэчаскага "patris" — радзіма) абазначае любоў да радзімы. Гэта з'ява глыбока прагрэсіўная. Яна адыграла вялікую ролю ў барацьбе за фарміраванне нацыянальных дзяржаў, у фарміраванні нацый, у барацьбе за нацыянальную свабоду. Ідэі і пачуцці патрыятызму заўсёды давалі штуршок развіццю культуры, з'яўляліся стымулюючымі фактарамі ў дзейнасці людзей.

Надзвычай важная роля ў выхаванні патрыятызму належыць музеям. Жаданне ведаць свае мінулае, імкненне пазнаць нацыянальныя вытокі, далучыцца да высокай культуры продкаў абумоўлівае пастаноўку новых задач перад музеямі. Музей з'яўляецца адным з сацыяльных інстытутаў, якія прызваны вярнуць духоўнасць грамадству. Яны ўваходзяць у адукацыйна-выхаваўчую сістэму грамадства. Аб гэтым, перш за ўсё, сведчыць той факт, што школьнікі і студэнты складаюць асноўны кантынгент наведвальнікаў музеяў.

Асноўнай формай прапаганды гістарычных ведаў і сродкам патрыятычнага выхавання з'яўляецца музейная экспазіцыя. Яна — аснова ўсіх форм зносін музея і наведвальніка. І наколькі экспазіцыя будзе адпавядаць патрабаванням сучаснасці, настолькі будзе ўзрастаць і эфектыўнасць адукацыйнай і выхаваўчай дзейнасці музеяў.

Вызначаючы навуковую канцэпцыю экспазіцыі, музейныя супрацоўнікі абапіраюцца на апошнія дасягненні гістарычнай навукі, на праўдзівае і аб'ектыўнае адлюстраванне гісторыі. Экспануемы музейны прадмет не можа ўсхваляць ці ачарняць. Ён — аб'ектыўны сведка падзей. Адсюль задача музейных работнікаў — больш поўна выкарыстоўваць музейныя экспанаты, іх камунікатыўныя магчымасці ў вывучэнні і прапагандзе гісторыі свайго краю, выхаванні патрыятызму.

У музейнай практыцы назапашана шмат сведчанняў таму, што экспазіцыя ўспрымаецца праз канкрэтныя мясцовыя матэрыялы і што паказ гістарычных з'яў неабходна будаваць на аснове лёсу канкрэтных людзей. Напрыклад, ва ўсіх экспазіцыях Музея абароны Брэсцкай крэпасці адлюстраваны лёсы абаронцаў Брэсцкай крэпасці, сем'яў камандзіраў, паказаны ўдзел дзяцей у яе абароне. Гэта дае магчымасць праз музейныя прадметы паказаць ход баявых дзеянняў, гераізм і мужнасць воінаў, іх адданасць Радзіме і гатоўнасць яе абараняць. Падкрэсліваючы падчас экскурсіі гэтыя аспекты, супрацоўнікі музея робяць вялікую справу выхавання патрыятызму.

У выхаванні грамадзяніна і патрыёта вялікую ролю іграе адлюстраванне ў музейных экспазіцыях праўды аб вайне, якой бы горкай і балючай яна не была. Безумоўна, кожная вайна разбурае традыцыйную маральнасць. Вайна — гэта культ сілы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жорсткасці, мабілізацыя ўсіх сіл грамадства на ажыццяўленне разбурэння і смерці. Але вайна — гэта і народная трагедыя, гэта мільёны чалавечых жыццяў, іх пакуты, слёзы, кроў. Памяць пра іх павінна застацца ў гісторыі народа назаўсёды. У гэтым пераконваюць нас экспазіцыі музеяў, што прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне, падзеі якой да сённяшняга часу хвалююць людзей.

Галоўным аспектам абноўленай экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны па-ранейшаму з'яўляецца мужнасць і гераізм воінаў, партызан, падпольшчыкаў. Але побач праходзіць агульначалавечая трагедыя вайны. "Калі ў 70—80 гады супрацоўнікі музея стваралі экспазіцыі з устаноўкай на тое, што "гісторыкі павінны апаэтызаваць народную вайну", то сёння музей не можа пагадзіцца з такой пастаноўкай пытання. Безумоўна, на вайне былі эпізоды, якія вартыя апаэтызавання, але іх было значна менш, чым эпізодаў, звязаных з горам, слязамі, крывёй. Большасць гераічных фактаў мелі трагедыйны падтэкст. Аб'ектыўнае адлюстраванне падзей і фактаў з'яўляецца адным з галоўных прынцыпаў навуковай канцэпцыі экспазіцыі"[3].

Найбольш дзейсным можна назваць выхаванне патрыятызму на гераічных традыцыях нашага народа. Вялікае значэнне ў гэтым маюць, як вядома, сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. Даныя сустрэчы дапамагаюць больш канкрэтна ўявіць і паглыбіць змест такіх паняццяў, як "Радзіма", "подзвіг", "герой", "патрыёт". Яны дазваляюць праблізіць мінулае, эмацыянальна пераадолець гістарычную дыстанцыю. З гэтым у музеязнаўстве суадносіцца адзін са шляхоў пераходу ад пачуццяў да ўпэўненасці, вызначэння жыццёвай пазіцыі, фарміравання духоўных якасцей маладога чалавека.

Ваенна-гістарычныя музеі служаць высакароднай ідэі выхавання патрыятызму яшчэ і тым, што ратуюць ад забыцця імёны сваіх суайчыннікаў — удзельнікаў тых ці іншых гістарычных падзей, у тым ліку і ваенных. Велізарная заслуга ў тым, што тэма абароны Брэсцкай крэпасці была паднята з небыцця, належыць супрацоўнікам Музея абароны Брэсцкай крэпасці. З'яўленне першых успамінаў сведкаў, публікацый — вынік вялікай пошукавай работы пісьменніка С. С. Смірнова, супрацоўнікаў музея і ветэранаў. Гэта работа працягваецца супрацоўнікамі музея і па сённяшні дзень. Дзякуючы іх намаганням за трыццаць год устаноўлены імёны 69 абаронцаў крэпасці.

Выхаванне патрыятызму арганічна спалучаецца з выхаваннем інтэрнацыяналізму. Тэорыя і практыка паказваюць, што нельга аддзяляць адзін народ ад другога, а тым больш — супрацьпастаўляць іх. Задача ў тым, каб паказаць падрастаючаму пакаленню, што народы павінны жыць у міры і згодзе. Ідэя паказваць канфлікты з мэтай выхавання ў людзей міралюбнасці — не новая, але яна застаецца актуальнай і сёння[4]. Самі па сабе экспанаты, якія звязаны з вайной, не могуць служыць дзейсным сродкам такога выхавання. Тэма міру павінна стаць адной з цэнтральных тэм у дзейнасці ваенна-гістарычных музеяў. Музеі павінна аб'ядноўваць агульная задача выхавання ў людзей міралюбнасці і згоды музейнымі сродкамі. Зберагаючы спадчыну, якая звязана з міратворчай дзейнасцю і культурай міру, а таксама спрыяючы таму, каб разуменне вытокаў канфлікту абапіралася на дакладныя факты, яны імкнуцца стаць сродкам выхавання ў людзей мірных настрояў. Музеі, якія дзейнічаюць такім чынам, прытрымліваюцца канцэпцыі ЮНЕСКА аб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пабудове культуры міру[5]. "Культура міру" — гэта вельмі шырокае паняцце. Яго ўкараненне ў грамадскую свядомасць спрыяе "падаўленню агрэсіўнасці сярод людзей, змене сацыяльных арыенціраў ад вайны да міру, ад псіхалогіі насілля да псіхалогіі згоды і талерантнасці"[6]. Не трэба думаць, што гэта адбудзецца хутка. Вельмі трывалыя былыя стэрэатыпы, на якіх было не адно пакаленне людзей. Задача музеяў сёння — "інфармаванне насельніцтва аб перавагах адкрытага ўстойлівага грамадства, аб сутнасці і значэнні культуры міру і міратворчай дзейнасці, аб гармоніі і мірным суіснаванні розных культур, этнасаў, нацый, рэлігій"[7].

З дапамогай музейных экспазіцый, культурна-адукацыйных праграм, іншых форм і метадаў музеі раскрываюць розныя бакі чалавечых адносін, прымушаюць наведвальніка задумацца над многімі балючымі праблемамі мінулага і сучаснага, вайны і міру.

Выхаванне сучаснай моладзі на прыкладах гісторыі, далучэнне іх да вопыту папярэдніх пакаленняў — гарантыя таго, што патрыятызм стане нормай нашага грамадства, што традыцыйныя паняцці гонару, годнасці, абавязку стануць прыярытэтнымі для большасці беларусаў.

---

[1] *Беляев В. И., Мухин М. И.* Концептуальные основы педагогики национальной школы // Адукацыя і выхаванне. 2001. № 4. С. 33.

[2] Канцэпцыя адукацыі і выхавання ў Беларусі // Адукацыя і выхаванне. 1993 № 12. С. 130.

[3] *Воронкова И. Ю.* Экспозиционная работа Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны: Традиции, современность, перспективы // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: Навукова-інфарм. зб. // Нац. б-ка Беларусі. 2000. Вып. 5. С. 17.

[4] *Даффи Т.* Концепция музея мира // Museum. 1993. № 177. С. 4—8.

[5] Рекомендации о воспитании в духе международного взаимопонимания, сотрудничества и мира и в духе уважения прав человека и основных свобод (19 ноября 1974 года) // Свод нормативных актов ЮНЕСКО. М., 1991. С. 138—143.

[6] *Сташкевіч А. Б.* Музей за мір і гармонію // Культура. 2000. 20—26 мая (№ 19—20). С. 4.

[7] Тамсама.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***В. У. Мірончык*** *(Мінск),*
*прарэктар па навуковай рабоце БелДІПК*

# ШЛЯХІ СТАНАЎЛЕННЯ МУЗЕЙНАЙ ПЕДАГОГІКІ Ў БЕЛАРУСІ

У апошнія гады ў сувязі з агульнай дэмакратызацыяй культурнага жыцця ў айчыннай музейнай справе актыўна ставяцца тэарэтычныя праблемы, узрастае неабходнасць даследаванняў, звязаных з абнаўленнем паняційнага апарату. Значную цікавасць у сувязі з гэтым прадстаўляе гісторыя станаўлення новага для беларускіх спецыялістаў паняцця "музейная педагогіка", запазычанага ў нямецкім музеязнаўстве.